■ Дыпламатыя ў дзеянні

# ВОПЫТ ПАДНЯБЕСНАЙ

## «Звязда» прэзентавала кнігу пра беларуска-кітайскія адносіны



**У 1990-я мала хто думаў, што беларуска-кітайскія адносіны могуць стаць настолькі перспектыўнымі. Але сёння мала з якой краінай у нас падтрымліваюцца кантакты настолькі шчырыя. «Вялікі камень» і ініцыятыва эканамічнага пояса Шаўковага шляху, сувязі ў адукацыі, СМІ, сельскай гаспадарцы, навуцы... А ў панядзелак вечарам у Доме сяброўства ў сталіцы адбылася прэзентацыя кнігі прафесара Анатоля ТОЗІКА, які ў свой час быў Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом нашай краіны ў Кітаі, а сёння ўзначальвае таварыства сяброўства «Беларусь — Кітай». Выданне называецца «Беларуска-кітайскія адносіны ва ўспамінах беларускіх паслоў» і прымеркавана да 25-годдзя ўстанаўлення беларуска-кітайскіх адносін.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Анатоль Тозік у размове з журналістамі расказаў, што «кітайскі цуд», магчымасць паўтору такога вопыту ў беларускіх рэаліях — адна з мэт кнігі.

— Лічу, што такі вопыт для нас выключна карысны і прымальны, таму што ў нас агульныя падыходы да ўнутранай, знешняй палітыкі. Мы ў гэтым вельмі блізкія.

На прэзентацыю кнігі прыйшло шмат высокіх гасцей. Гэта і **намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Баляслаў ПІРШТУК, і міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ, і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая ў нашай краіне Цуй Цымін...** Ганаровымі гасцямі мерапрыемства сталі беларускія дыпламаты, якія ў свой час працавалі ў Кітаі. Менавіта на аснове іх успамінаў і была напісана гэта кніга.

Баляслаў Пірштук прызнаўся, што яго асабіста шмат што звязвае з Паднябеснай, раней па рабоце яму не раз даводзілася там бываць. Лілія Ананіч звярнула ўвагу на важнасць развіцця ўзаемадзеяння паміж Беларуссю і КНР у розных сферах, у тым ліку па лініі кнігавыдавецтва.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# Дармаед ці не дармаед?

## Разабрацца ў гэтым пытанні дапамогуць камісіі, якія будуць створаны ў раёнах Гомельскай вобласці

**Больш як 5,5 тысячы фізічных асоб — жыхароў Гомельшчыны ўжо вызвалены ад неабходнасці выплаты так званага падатку за ўтрыманства. У асноўным гэта людзі, якія ў 2015 годзе працавалі за мяжой. Дарэчы, «лісты шчасця» ў вобласці ўручылі 92 тысячам чалавек.**

**Намеснік начальніка абласной падатковай інспекцыі Дзмітрый ДАЙНЭКА** расказаў на брыфінгу, што 35 чалавек вызвалілі ад выплаты па рашэнні мясцовых органаў улады. Нагадаем, што ўжо сёлета ў Дэкрэт №3 «Аб папярэджванні сацыяльнага ўтрыманства» былі ўнесены змяненні. У тым ліку дапоўнены пералік асоб, якім не трэба выплачваць збор.

Тыя ж, хто не аспрэчвае абавязак выплаты збору, пачалі ўносіць плацяжы. Штодня з дзяржавай за сацыяльныя выгоды разлічваюцца 230—250 чалавек. Унесці аплату неабходна да 20 лютага.

Тым часам старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік на нарадзе ў аблвыканкаме даручыў забяспечыць калегіяльнасць у прыняцці рашэнняў па пункце 15-1 Дэкрэта №3, які прадугледжвае назначэнне льгот па выплаце збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў людзям, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Кіраўнік вобласці даў распараджэнне аператыўна стварыць пры ўсіх райвыканкамах камісіі, у якія будуць уключаны спецыялісты розных сфер дзейнасці.

Да таго ж з 24 студзеня да 1 сакавіка падатковыя інспекцыі ва ўсіх раёнах Гомельшчыны будуць штодня з 10.00 да 12.00 праводзіць прамыя тэлефонныя лініі па пытаннях рэалізацыі Дэкрэта №3 «Аб папярэджванні сацыяльнага ўтрыманства». Нумар прэс-цэнтра інспекцыі МНС па Гомельскай вобласці — 8 (0232) 79 88 28.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Жыллё

# ІЛЬГОТНАЕ КРЭДЫТАВАННЕ ЗАМЕНЯЦЬ АДРАСНАЙ ДЗЯРЖПАДТРЫМКАЙ

**Аб гэтым гаворыцца ў пастанове Савета Міністраў ад 12 студзеня 2017 года №18, якая зацвярджае комплекс мер па рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады.**

У прыватнасці, у дакуменце гаворыцца, што для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, будзе прадугледжана замена льготнага крэдытавання жыллёвага будаўніцтва крэдытаваннем на рынкавых умовах з адраснай дзяржаўнай падтрымкай такіх асоб за кошт бюджэтных сродкаў. Пастанова ўдакладняе, што пераход да новага прынцыпу фінансавання жыллёвага будаўніцтва для «чаргавікоў» будзе рэалізаваны на працягу гэтага года. Дакладны механізм такой адраснай дзяржпадтрымкі сёлета павінны распрацаваць спецыялісты Мінбудархітэктуры, Мінэканомікі, Мінфіна, Нацыянальнага банка, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама.

Таксама дакумент прадугледжвае стварэнне агенцтва па іпатэчным жыллёвым крэдытаванні для развіцця інфраструктуры рынку іпатэчнага жыллёвага крэдытавання, забеспячэння яго ўстойлівасці, ліквіднасці і павышэння даступнасці жылля для насельніцтва. Непасрэдна эксперты будаўнічай галіны павінны будуць на працягу 2017—2018 гадоў распрацаваць механізм фінансавання будаўніцтва інжынернай і транспартнай інфраструктуры ў раёнах жылой забудовы на ўмовах дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Акрамя таго, ужо сёлета грошы грамадзян на набыццё і будаўніцтва жылля плануецца вызваліць ад дэкларавання і падатковых праверак.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# НАЛЕТА КАМУНАЛКУ БУДЗЕМ АПЛАЧВАЦЬ ЦАЛКАМ

**Не менш за 75% ад рэальнага кошту аказання паслуг сёлета і 100% у 2018-м — такі рост лічбаў у жыллёва-камунальнай гаспадарцы чакае насельніцтва. Наступныя два гады тарыфы будуць падтрымлівацца на ўзроўні, які забяспечыць поўную кампенсацыю імі затрат на ЖКГ-абслугоўванне. Пакрыццё расходаў у транспартным сэрвісе налета плануецца павысіць для грамадзян да 70% і на працягу 2019—2020 гадоў прытрымлівацца дасягнутых лічбаў.**

Усе павышэнні прадугледжаны комплексам мер па рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады, зацверджаным Саветам Міністраў у студзені бягучага года. Пры гэтым павелічэнне кошту ў галіне ЖКГ будзе праводзіцца з улікам зніжэння затрат на аказанне паслуг і атрымання грамадзянамі безнаяўных жыллёвых субсідый.

Тарыфныя пераўтварэнні ў галінах транспарту і ЖКГ патрабуе правесці і Міжнародны валютны фонд, што з'яўляецца адной з умоў атрымання нашай рэспублікай крэдыту у $3 млрд. Пры гэтым запланавана прыняць сістэмныя меры па аптымізацыі расходаў на аказанне жыллёва-камунальных і транспартных паслуг.

Нагадаем, што з 1 студзеня цеплаэнергія ў краіне падаражэла на 17% і склала крыху больш за 15,5 рубля за 1 Гкал. На столькі ж працэнтаў у ацяпляльны перыяд вырас і кошт прыроднага газу. Цяпер яго кубічны метр каштуе 0,0908 рубля, а летам кошт павялічыцца да 0,2842 рубля. Апошняя лічба дзейнічае і зімой для грамадзян, што не маюць прыбораў уліку расходу газу.

За 2017—2020 гады мяркуецца таксама дасягнуць 100% кампенсацыі насельніцтвам і тарыфаў на паслугі электрасувязі і пошты.

У сваю чаргу, скарачэнне перакрыжаванага субсідзіравання з 2019 года павінна прывесці да зніжэння тарыфаў для рэальнага сектара эканомікі.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

# МЯНЯЕЦЦА ПАМЕР ДЗІЦЯЧЫХ ВЫПЛАТ

**З 1 лютага ў Беларусі павялічыцца памер выплат па доглядзе за дзецьмі ва ўзросце да трох гадоў. Новы памер дапамог будзе дзейнічаць па 30 красавіка гэтага года.**

Для разліку памеру гэтых дапамог будзе прымяняцца паказчык сярэднямесячнай заработнай платы за чацвёрты квартал 2016 года, які быў роўны 746,80 руб.

Такім чынам, з лютага памер штомесячнай дапамогі па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў складзе на першае дзіця 261,38 руб. (або 35% сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў па краіне), на другое і наступных дзяцей — 298,72 руб. (ці 40% сярэднямесячнай заработнай платы), на дзіця-інваліда ва ўзросце да трох гадоў — 336,06 руб. (45% сярэднямесячнай заработнай платы незалежна ад чарговасці нараджэння гэтага дзіцяці ў сям'і).

Сем'ям, якія пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання ў зоне наступнага адсялення або з правам на адсяленне, дапамога па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў прызначаецца і выплачваецца ў памеры 150% да ўстаноўленай законам.

З лютага зменіцца і памер аднаразовых выплат у сувязі з нараджэннем дзіцяці. Гэтыя выплаты залежаць ад памеру бюджэту пражытковага мінімуму (БПМ). Колькі будуць плаціць у сувязі з нараджэннем дзіцяці, стане вядома пасля прыняцця пастановы Мінпрацы і сацабароны аб устанаўленні новага памеру БПМ на перыяд з 1 лютага па 30 красавіка 2017 года.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# Матывацыя для маладых педагогаў

**Маладым спецыялістам з катэгорыі педагагічных работнікаў, якія ўжо адпрацавалі па размеркаванні два гады, але працягваюць працаваць у гэтай жа ўстанове адукацыі, яшчэ на год падаўжаецца выплата даплаты ў памеры адной тарыфнай стаўкі першага разраду. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 19 студзеня 2017 года №48.**

Згодна з рашэннем урада, маладыя настаўнікі, якія працуюць ва ўстанове адукацыі трэці год, будуць атрымліваць даплату ў памеры адной тарыфнай стаўкі першага разраду, якая зараз складае 31 рубель. Даплаты будуць выплачвацца маладым спецыялістам па асноўным месцы працы прапарцыянальна адпрацаванаму часу. Пастанова ўступае ў сілу з 1 студзеня 2017 года.

У Міністэрстве адукацыі спадзяюцца, што гэта мера дазволіць не дапусціць зніжэння заробкаў у маладых спецыялістаў і іх адтоку з устаноў адукацыі. Захаванне даплаты яшчэ на адзін год дасць магчымасць маладым педагогам прайсці атэстацыю для атрымання другой кваліфікацыйнай катэгорыі. Інструкцыяй аб атэстацыі педагагічных работнікаў устаноўлена, што прэтэндаваць на прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі могуць педагагічныя работнікі, якія маюць стаж працы на пасадзе, па якой атэстуюцца, два гады. Надбаўка за другую кваліфікацыйную катэгорыю складае 30% ад тарыфнага акладу (стаўкі).

Дарэчы, у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце праводзілі маніторынг і ўстанавілі, што ад 65 да 80% яго выпускнікоў, адпрацаваўшы два гады пасля заканчэння ўніверсітэта, застаюцца ў той жа школе. У некаторых раёнах гэты паказчык увогуле дасягае 90—100 працэнтаў. Цяпер маладыя педагогі будуць яшчэ больш матываваныя да таго, каб застацца на першым працоўным месцы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Пытальнік

## ЧАКАЙЦЕ, ГЛЕДАЧЫ, ПЕРАДАЧА ВЕРНЕЦЦА Ў ЭФІР

**Вітаю, дарагая рэдакцыя газеты «Звязда»! Піша вам пенсіянерка. Шмат гадоў я глядзела тэлеперадачу «Чакай мяне. Беларусь», але з восені яна перастала выходзіць у эфір. Я хачу даведацца, чаму? Можа быць, яна з пачатку новага года зноў будзе выходзіць?**

**Рэгіна Данілаўна ЛІПНІЦКАЯ,**
**вёска Возера Уздзенскага раёна.**

**Перадача «Чакай мяне. Беларусь» — мая любімая. Ніколі яе не прапускаў, глядзеў кожны выпуск, бо заўсёды кранаў гісторыі герояў. Вельмі шкада, што яна знікла з тэлевізійнай праграмы. Ці плануецца яе вяртанне на экраны?**

**Тадэвуш Антонавіч САДОЎСКІ,**
**вёска Далгінава Вілейскага раёна.**

Як расказала на наш запыт прэс-сакратар тэлеканала АНТ Юлія Дубоўская, цяпер усе гісторыі, звязаныя з пошукам суайчыннікаў на тэрыторыі нашай краіны, выходзяць у аднайменнай з перадачай рубрыцы ў праграме «Наша раніца». У такім фармаце яна будзе трансліравацца яшчэ некалькі месяцаў, пасля чаго, сапраўды, плануецца вярнуць у эфір саму перадачу «Чакай мяне. Беларусь». Чаму яна на нейкі час знікла з экранаў? Гэта звязана з тэхнічнымі прычынамі. Як вядома, у Расіі перадача запісваецца з усіх краін, мы бралі толькі частку з расійскіх выпускаў. Была праблема з гэтым самым запісам са спадарожніка. Але, паколькі вельмі многія тэлегледачы палюбілі перадачу і чакалі яе, было вырашана часова выпускаць тыя гісторыі, якія ўжо былі знятыя, у фармаце паўнацэннай рубрыкі. Напрыканцы Юлія Дубоўская параіла аматарам «Чакай мяне. Беларусь» сачыць за тэлепраграмай, каб не прапусціць яе вяртанне ў эфір у ранейшым фармаце.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*